...ТОЕ, ШТО НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ

Фота БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзімір Пуцін асабліва адзначыў важнасць сумеснай падрыхтоўкі да святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: «Наш агульны абавязак перад пакаленнем пераможцаў годна адзначыць гэты юбілей».

Іншыя ўдзельнікі пасяджэння таксама выказаліся ў падтрымку ўсіх пытанняў, якія складаюць парадак дня саміту. У сваіх выступленнях яны падкрэслілі намеры і ў далейшым садзейнічаць развіццю супрацоўніцтва ў СНД па ўсіх напрамках.

СНД хацела б вяртання Грузіі

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што некалькі гадоў таму з Садружнасці Незалежных Дзяржаў выйшла Грузія. «Відаць, тады для гэтага былі пэўныя ўнутраныя матывы. Але жыццё не стаіць на месцы. Мы як жылі побач адзін з адным, так і працягваем жыць», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Адкрыта заяўляю, і гэта не толькі маё меркаванне, што мы хацелі б, каб Грузія вярнулася ў склад Садружнасці», — падкрэсліў беларускі лідар. «Думаю, Грузія пачуе гэтае пасланне», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што казаў пра гэта і напярэдадні беларускага старшынства ў СНД і, паводле яго слоў, гэты год не прайшоў дарма.

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, у Грузіі вельмі многія, у тым ліку і ў кіраўніцтве, жадаюць мець пляцоўку, дзе можна абмяркоўваць не толькі палітычныя, але і эканамічныя пытанні. «Думаю, для таго, каб ад слоў перайсці да справы, нам трэба шукаць не тое, што нас раз'ядноўвае, а тое, што аб'ядноўвае, і мы атрымаем ад гэтага адпаведны выйгрыш. У канчатковым рахунку, усё гэта ацэняць нашы людзі як у Садружнасці, так і ў Грузіі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. «Хацелася б, каб мы не забывалі, што наша Садружнасць — гэта жывы арганізм, а любому арганізму трэба развіццё», — дадаў беларускі лідар.

Гэтую думку падтрымаў і Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, які сказаў, што дзверы СНД для Грузіі заўсёды расчыненыя.

Украіна абяцае пастульпальнае развіццё

Старшынства Украіны ў СНД у 2014 годзе будзе накіравана на забеспячэнне пастульпальнага развіцця Садружнасці і ўмацаванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, заявіў Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч. «Сваю работу ў адпаведнасці з канцэпцыяй старшынства мы плануем накіраваць у першую чаргу на забеспячэнне далейшага пастульпальнага развіцця СНД і ўмацаванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, якое адпавядае нацыянальным інтарэсам кожнай дзяржавы-ўдзельніцы», — сказаў Віктар Януковіч.

Паводле яго слоў, адным з прыярытэтных напрамкаў работы Украіна бачыць далейшае развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якое павінна грунтавацца на палажэннях дагавора аб зоне свабоднага гандлю і прынцыпах СГА. «Гэты дагавор, па нашым перакананні, павінен запрацаваць у поўную сілу, а закладзеныя ў ім механізмы — стаць рэальна дзейнымі, — сказаў Прэзідэнт Украіны. — Варта сфарміраваць усе неабходныя ўмовы для забеспячэння раўнапраўнай канкурэнцыі, абароны правоў уласніка і інвестара, зняць штучныя бар'еры, якія ўсё яшчэ маюць месца і перашкаджаюць гандлёваму і інавацыйнаму супрацоўніцтву».

«Важна таксама, каб на аснове міжнародных нормаў і прынцыпаў, закладзеных у дамове, зарабілі механізмы разгляду спрэчных пытанняў у гандлі», — дадаў Віктар Януковіч.

Ён паведаміў, што ў перыяд старшынства ў СНД намаганні Украіны таксама будуць накіраваны на падрыхтоўку да падпісання пагадненняў аб транзіце трубаправодным транспартам, гандлі паслугамі, пратакола аб паэтапнай адмене экспартных пошлін.

На думку Віктара Януковіча, агульным інтарэсам краін СНД таксама адпавядае рэалізацыя сумесных праектаў у навукова-тэхнічнай і інавацыйнай галінах, энергетыцы, транспарце, машынабудаванні, сельскай гаспадарцы. «Найважнейшым аспектам узаемадзеяння ў СНД Украіна лічыць энергетычную сферу. Перш за ўсё, гэта датычыцца развіцця супрацоўніцтва па пытаннях транспарціроўкі энергарэсурсаў, забеспячэння надзейнасці іх паставак, выпрацоўкі зразумелых і дакладных прынцыпаў дзейнасці дзяржаў-удзельніц на рынку энерганосьбітаў», — сказаў Прэзідэнт Украіны. Паводле яго слоў, неабходна пашыраць узаемадзеянне і ў сферах, звязаных з электразабеспячэннем. У сувязі з гэтым мяркуецца правесці шэраг міжнародных канферэнцый, «круглых сталоў» і пасяджэнняў органаў галіновага супрацоўніцтва.

Асаблівую ўвагу ў год старшынства ў Садружнасці Украіна плануе надаць культурна-гуманітарнаму супрацоўніцтву, пры гэтым асобны акцэнт будзе зроблены на правядзенне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. 2015 год у СНД вырашана абвясціць Годам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Віктар Януковіч выказаў удзячнасць Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку за паспяховае старшынства ў СНД у гэтым годзе. «Па маім перакананні, беларускім бокам праведзена вялікая работа ў напрамку пашырэння ўзаемадзеяння нашых краін у рамках СНД на карысць кожнага чалавека», — сказаў ён.

У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка ад імя Савета кіраўнікоў дзяржаў пажадаў Украіне паспяховага старшынства ў наступным годзе. «Тая праграма, якая сёння прапанавана вамі, з'яўляецца шырокай і ўнікальнай», — адзначыў беларускі лідар.

■ Меркаванне

САДРУЖНАСЦЬ ПЕРААСЭНСОЎВАЕ СВАЮ РОЛЮ



Не будзе перабольшваннем сказаць, што Садружнасць Незалежных Дзяржаў перажывае на нашых вачах адзін з найбольш цікавых этапаў у сваім развіцці. Гэта звязана з працэсамі еўразійскай інтэграцыі, ініцыяванымі Расіяй, Беларуссю і Казахстанам. Сёння адбываецца пераасэнсаванне ролі арганізацыі: СНД прымае на сябе функцыі не толькі рэгіянальнага міжнароднага рэгулятара і дыскусійнай пляцоўкі, якой дэ-факта супольнасць была да гэтага часу, але і становіцца адной з фабрык еўразійскага інтэграцыйнага працэсу, дзе выпрацоўвацца фармат узаемадзеяння будучага Еўразійскага эканамічнага саюза з іншымі дзяржавамі з ліку рэспублік былога СССР.

Аб правільнасці такога меркавання сведчаць падзеі, што адбыліся падчас Мінскага саміту 24-25 кастрычніка. У рамках форуму прайшло пасяджэнне Вышэйшага еўразійскага эканамічнага савета, дзе былі дасягнуты важныя пагадненні аб далейшым развіцці інтэграцыі і аб далучэнні да працэсу новых удзельнікаў. Цягам дыскусіі бакі нарэшце падышлі да вырашэння шэрагу спрэчных пытанняў, але засталіся і такія, кампрамісу па якіх дасягнуць пакуль не атрымалася.

Саюз без выключэнняў

Значным поспехам можна назваць тое, што Беларусі і Казахстану ўдалося пераканаць расійскіх партнёраў у неабходнасці ліквідацыі выключэнняў і абмежаванняў у працы Мытнага саюза і забеспячэння роўных умоў гаспадарання для ўсіх суб'ектаў Адзінай эканамічнай прасторы. Відавочна, што без такой меры працэс эканамічнай інтэграцыі, ва ўмовах удзелу Расіі ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі, страчвае ўсякі сэнс.

Так, беларускія вытворцы зараз вымушаны канкурыраваць на расійскім рынку з замежнымі таварамі, згодна з нормамі СГА. Пры гэтым яны не маюць ніякіх прывілеяў ад удзелу ў Мытным саюзе, але губляюць дадатковыя прыбыткі з-за выплат расійскаму боку экспартных мытных плацяжоў. Толькі ад прыбыткаў нафтаперапрацоўкі Беларусь пералічвае ў расійскі дзяржаўны бюджэт некалькі мільярдаў долараў ЗША.

Безумоўна, калі казаць аб эканамічных інтарэсах Расіі, гэта выглядае справядліва, але калі разважаць наднацыянальнымі, інтэграцыйнымі катэгорыямі, то больш слушна, калі кожны з удзельнікаў гатовы ўступіць частку сваіх інтарэсаў на карысць агульнага развіцця. Менавіта такія абавязкі ўзяў на сябе Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, які па выніках пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета заявіў, што «расійскі бок гатовы пайсці на ліквідацыю ўсіх абмежаванняў, у тым ліку па нафце і нафтапрадуктах. Гэта страта для нашага бюджэту, аднак мы гатовы пайсці на такія меры».

Пры гэтым неабходна разумець, што працэс ліквідацыі абмежаванняў не тычыцца адной нафтаперапрацоўчай галіны. Гаворка ідзе пра пошук балансу інтарэсаў, калі будуць ліквідаваны ўсе без выключэння бар'еры на шляху свабоднага руху тавараў, паслуг і капіталаў, таму, акрамя «плюсаў», беларускіх вытворцаў чакае таксама ўзмацненне канкурэнцыі, а дзяржава будзе не здольная абараніць іх пратэкцыяніскімі мерамі. Кіраўнікі айчыннай прамысловасці заяўляюць, што да такой канкурэнцыі беларускі рэальны сектар гатовы. Развіццё інтэграцыйных працэсаў пакажа, як гэтыя заявы суаднасяцца з рэчаіснасцю.

Яшчэ адной рызыкай развіцця інтэграцыі з'яўляецца сітуацыя ў самой Расіі. Ужо неаднаразова расійскае вышэйшае кіраўніцтва дэкларавала схільнасць да стварэння моцнага эканамічнага саюзу на аснове прыярытэту агульнага інтарэсу, аднак такія намеры супярэчылі памкненням да атрымання хуткага прыбытку расійскай фінансава-сыравіннай бізнес-супольнасці ды так і заставаліся на ўзроўні дэкларацый, «згубіўшыся» ў розных «узгадненнях» і «ратыфікацыях».

Пашырэнне без праблем

Другім найбольш важным пытаннем саміту стала абмеркаванне пашырэння Мытнага саюза за кошт далучэння новых удзельнікаў — Кыргызстана і Арменіі. Відавочна, што сам факт такога абмеркавання ў рамках Садружнасці сведчыць аб абнаўленні геапалітычнай місіі СНД.

У цэлым, пашырэнне Мытнага саюза было ўспрынята ўдзельнікамі пазітыўна, аднак зразумела, што на гэтым шляху як Арменію, так і Кыргызскую Рэспубліку чакае шмат цяжкасцяў, звязаных з прыняццем на сябе абавязкаў наднацыянальнага характару.

Да таго ж існуе пэўная эканамічная рызыка такога працэсу: інтэграцыйны эфект дасягаецца ад удзелу прыблізна роўных па сваіх магчымасцях рэспублік, у той час як Арменія, так і Кыргызстан значна адстаюць у сваім эканамічным патэнцыяле ад дзяржаў «мытнай тройкі». Такая няроўнасць можа прывесці да дысбалансу развіцця саюзу, з чым ужо сутыкнуліся кіраўнікі Еўрапейскага саюза, калі краіны Паўднёвай і Цэнтральнай Еўропы фактычна датуюцца з боку больш развітых заходніх дзяржаў.

Асабліва няпростай бачыцца сітуацыя з уключэннем у інтэграцыю Кыргызстана. Рэспубліка мае лішкі працоўных рэсурсаў, і менавіта стымуляцыя працоўнай міграцыі як крыніцы існавання эканомікі з'яўляецца асноўным матывам еўразійскіх памкненняў кіргізскага кіраўніцтва. У той самы час Кыргызстан — краіна з вельмі няпростай крымінагеннай сітуацыяй, значным уплывам наркамафіі і экстрэмісцкіх рэлігійных груповак на грамадскія працэсы.

Нядаўнія беспарадкі паміж карэннымі жыхарамі і мігрантамі з Сярэдняй Азіі ды Закаўказзя ў маскоўскім Бірулёве — яшчэ адно сведчанне міжэтнічных праблем, з якімі ўжо зараз сутыкнулася Расія. Гэта сігнал пра тое, што ўключаць цэнтральнаазіяцкія краіны ў інтэграцыйны працэс толькі ў якасці крыніцы таннай працоўнай сілы з'яўляецца небяспечным для поспеху самой ідэі еўразійскай інтэграцыі.

Найбольш адэкватным рашэннем стала б індустрыялізацыя цэнтральнаазіяцкага рэгіёна пад патрэбы будучага Саюза, з забеспячэннем занятасці насельніцтва на ўласнай тэрыторыі, што дазволіць скарэктаваць эканамічныя магчымасці краін і адначасова атрымаць эфект ад стварэння дадатковых прамысловых актываў з выкарыстаннем адносна таннай працоўнай сілы.

Па-ранейшаму спрэчным застаецца пытанне ўзаемадзеяння дзяржаў Мытнага саюза і Украіны. Расійскі бок працягвае займаць досыць жорсткую пазіцыю адносна афіцыйнага Кіева, які абраў еўрапейскі вектар інтэграцыі. Беларусь і Казахстан настойваюць на неабходнасці ўтварэння для Украіны адмысловых формаў кааперацыі. Салідарна з беларусамі і казахамі выступіла ўкраінская дэлегацыя. Відавочна, што Украіна не зацікаўлена ў тым, каб «спаліць усе масты» з дзяржавамі Мытнага саюза, і зразумела, што стварэнне асаблівых формаў супрацоўніцтва можа захаваць Украіну для еўразійскай інтэграцыі ў будучым.

СНД на тое і з'яўляецца перамоўнай пляцоўкай інтэграцыі, каб кожны з партнёраў у пошуках кампрамісу выказаў уласнае меркаванне, а ад поспеху нацыянальнай дыпламатыі залежыць геапалітычная вага асобнай краіны ў інтэграцыйных працэсах.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ

ПЕРАМОГА — АДНА НА ЎСІХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Не буду ўтойваць: напярэдадні былі вельмі жывыя дыскусіі па цэлым шэрагу пытанняў і па ўхваленых міністрамі замежных спраў праграмах па барацьбе са злачыннасцю, наркабізнесам, гандлем людзьмі, тэрарызмам. Але ўсё гэтае рознагалоссе дзякуючы гатоўнасці да кампрамісаў і жаданню дасягнуць калектыўнага выніку ў інтэграцыйным узаемадзеянні было знята, — сказаў Сяргей Лебедзеў.

Яшчэ адным значным дакументам у гуманітарнай сферы стала Стратэгія развіцця супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці ў галіне турызму на перыяд да 2020 года, у праекце якой вызначаны асноўныя кірункі і механізмы супрацоўніцтва і фарміравання агульнай турыстычнай прасторы СНД. Чакаецца, што паспяховая рэалізацыя Стратэгіі дазволіць дзяржавам СНД найбольш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці агульнай прасторы для павышэння канкурэнтаздольнасці турыстычных паслуг і прасоўвання турыстычных прадуктаў.

На пасяджэнні быў прыняты праект рашэння аб аб'яўленні горада Алматы (Казахстан) і Ош (Кыргызская Рэспубліка) культурнымі сталіцамі Садружнасці ў 2014 годзе. Таксама быў ухвалены план рэалізацыі Стратэгіі моладзевага супрацоўніцтва ў рамках СНД на 2014 — 2015 гады. Праект плана змяшчае больш за 100 мерапрыемстваў, накіраваных, у тым ліку, на сістэму падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў па справах моладзі, падтрымку сацыяльна неабароненай часткі моладзі. Плануецца правядзенне самых розных па фармаце гуманітарных праектаў, якія звязаны з папулярызацыяй здаровага ладу жыцця, прыцягненнем моладзі ў прадпрымальніцкую дзейнасць, фарміраваннем агульнай інфармацыйнай прасторы ў сферы моладзевага супрацоўніцтва, прафілактыкай экстрэмізму.

Кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў СНД ухвалілі праекты сярэднетэрміновых міждзяржаўных мэтавых праграм сумесных мер барацьбы са злачыннасцю, тэрарызмам і іншымі праявамі экстрэмізму, незаконным абаротам наркотыкаў, гандлем людзьмі. Міністры абмеркавалі таксама праект пагаднення аб стварэнні Міждзяржаўнага савета па супрацьдзеянні карупцыі, які заклікаңы садзейнічаць набліжэнню і гарманізацыі нацыянальнага антыкарупцыйнага заканадаўства і ўдасканаленню прававой базы СНД у гэтай сферы.

Наступнае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў СНД пройдзе ў Маскве 4 красавіка 2014 года.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Наш футбол

«Я ЗАЎЖДЫ АДКРЫТЫ ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ»

Трэнерскія змены ў стане барысаўскага БАТЭ рэдкія, як дождж у пустыні. За ўсю сучасную гісторыю клуба, якая пачынаецца з 1996 года, на капітанскім мосціку да апошняга часу было ўсяго тры спецыялісты: Юрый Пунтус, Ігар Крывушэнка і Віктар Ганчарэнка. Але нядаўні пераезд у Краснадар Ганчарэнкі, зразумела, спарадзіў новае трэнерскае назначэнне. Праўда, новы веласіпед у Барысаве прыдумляць не сталі, замежнікаў не запрашалі, а вырашылі даверыць калектыў старшаму трэнеру калектыву Аляксандру ЕРМАКОВІЧУ, чалавеку, які амаль усё сваё спартыўнае жыццё прысвяціў БАТЭ. Як футбаліст ён знакавая фігура для каманды. А вось у трэнерскім складніку — асоба для многіх пакуль незнаёмая. І каб адкрыта прэзентаваць «коўча», барысаўскі клуб арганізаваў спецыяльную прэс-канферэнцыю, на якой новы галоўны трэнер упершыню ў шырокім фармаце пагутарыў з прэсай.

Фота Надзеі БУЖАН.

Пра новую пасаду

— Ведаеце, калі працуеш старшым трэнерам, дзесьці ўжо разумееш, як зрабіў бы на месцы галоўнага трэнера ў той ці іншай сітуацыі, — адзначае 38-гадовы спецыяліст. — Здаецца, на пачатку года ў адной з размоў з Анатолем Капскім, старшынёй праўлення ФК БАТЭ, ён спытаў, што думаю пра тое, каб калісьці ўзначаліць каманду. Зразумела, пасля таго пытання я ўжо ў пэўным сэнсе ўяўляў сябе ў гэтай ролі.

Трэнеры-настаўнікі

— Усе трэнеры, з якімі я працаваў, пакінулі ўва мне частку сябе. Я заўжды сачыў за імі, аналізаваў іх працу. Але найбольшы ўклад у маё трэнерскае станаўленне ўнёс Віктар Міхайлавіч Ганчарэнка. Я ўдзячны яму за тое, што ён у свой час запрасіў мяне ў трэнерскі штаб каманды, ніколі не ўтойваў ад мяне інфармацыю, дзяліўся ёю.

Што тычыцца замежных спецыялістаў, мне падабаецца праца Лучана Спалеці, Масіміліяна Алегры, Карла Анчэлоці. Мне цікава назіраць за работай усіх топ-трэнераў.

Параўнанні з Ганчарэнкам

— Я спадзяюся, што падрыхтаваны да гэтага. Але як будзе ўсё насамрэч, пакажа толькі час.

Пра інтарэс да былога галкіпера БАТЭ Юрыя Жаўнова, які нядаўна пакінуў піцерскі «Зеніт»

— Юрый — выдатны варатар. Аднак у яго вялікія праблемы са здароўем. Найперш трэба, каб ён паправіўся. І калі ў яго будзе ўсё ў парадку, тады можна будзе весці нейкую размову. Праўда, усе рашэнні пра новыя трансферы будзем прымаць ужо напрыканцы сезона. У нас ёсць пэўныя планы, намёткі, але казаць пра іх яшчэ дачасна.

Аб працоўных спрэчках з былым трэнерам

— Мы з Віктарам Міхайлавічам аднадумцы. Зразумела, у нас, як у любым трэнерскім штабе, часам узнікалі пэўныя пытанні, рознагалоссі, але буйных спрэчак не было. Цяпер як галоўны трэнер буду прасоўваць свае ідэі.

Змена ў стаўленні футбалістаў пасля прызначэння

— У гэтым я не адчуў вялікай розніцы. У вачах футбалістаў, іх паводзінах я бачыў падтрымку, адчуваў давер. Падобнае было і падчас трэніровак, і падчас гульні. Я вельмі ўдзячны ім за гэта.

Аляксандр Глеб з Віктарам Ганчарэнкам былі на «ты»...

— Ён, напэўна, са многімі на «ты». Аднак падобнае не азначае, што паміж імі не было дыстанцыі «трэнер — футбаліст». Тое ж самае і ў мяне. Аднак да Аляксандра няма ніякіх прэтэнзій да працы ў трэніровачным працэсе, паводзін у калектыве. Усё роўна ў нас ёсць субардынацыя, якой ён прытрымліваецца.

Сустрэча з балельшчыкамі

— Мяркую, што яе арганізуюць. Мы часам ладзім для іх сустрэчы, адкрытыя трэніроўкі каманды, куды заўзятары таксама прыязджаюць. Я заўжды адкрыты для аматараў футбола, і іх погляд вельмі важны для мяне і клуба.

Будаўніцтва новага стадыёна

— У нас з'явіцца цудоўны стадыён. І чым раней мы выйдзем на яго газон, тым для нас будзе больш прыемна. Ведаю, колькі высілкаў для гэтага прыкладаюць людзі, якія займаюцца будоўляй. Футбалістам і трэнерскаму штабу хочацца згуляць на новым стадыёне ўжо сёлета.

Камплектаванне трэнерскага складу

— Мы дапрацуем сезон з трэнерскім штабам, які маем цяпер. Ужо пасля падумаем над тым, ці трэба нешта мяняць. І калі нам будзе нехта неабходны, безумоўна, будзем далучаць.

Пра відовішчны футбол

— Мы ўсе хочам, каб нашы футбалісты заўжды паказвалі яркі, відовішчны футбол. На жаль, нават не ўсе топ-клубы дэманструюць вельмі прыгожы футбол, бо рабіць гэта пастаянна вельмі складана. Мы таксама стараемся, але не заўжды нашы жаданні супадаюць з нашай рэчаіснасцю.

Стажыроўкі і замежныя знаёмствы

— Я часта ездзіў на стажыроўкі разам з Віктарам Міхайлавічам. У яго больш шчыльны кантакт менавіта з галоўнымі трэнерамі. Што да мяне, перад гульнёй з «Гомелем» я размаўляў з Леанідам Кучуком, галоўным трэнерам маскоўскага «Лакаматыва». Цяпер планую сустрэцца і пагутарыць з ім.

Галоўнае ўражанне ад кар'еры футбаліста

— Гэта першае чэмпіёнства БАТЭ ў 1999 годзе. У той час падобнае для нас было ўпершыню. Трэба ўзгадаць і ўдзел у Лізе чэмпіёнаў. Згуляць у гэтым турніры марыць кожны футбаліст.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Даты

ПОБАЧ «БЕЛАРУСКІ ПЕЙЗАЖ» І «АРАРАТ ВЯСНОЙ»

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне паштовы блок, прысвечаны 20-годдзю ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Арменія. Нашу краіну на ім прадстаўляе рэпрадукцыя карціны Віталя Цвіркі «Беларускі пейзаж», Арменію — рэпрадукцыя карціны Марціроса Сар'яна «Арарат вясной».

Ва ўрачыстай цырымоніі гашэння паштовага блока на канверце «Першы дзень» прымалі ўдзел першы намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Міхневіч, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Арменія ў Рэспубліцы Беларусь Армен Хачатран, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея нашай краіны Уладзімір Пракапцоў, генеральны дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» Ірына Саксонава.

Паводле яе слоў, сумесныя выпускі паштовай прадукцыі аб'ядноўваюць атрымальнікаў паштовых паслуг, прапагандуюць культурную спадчыну нашых дзяржаў і садзейнічаюць далейшаму ўмацаванню супрацоўніцтва — у галіне навукі, адукацыі, турызму і эканомікі. Да таго ж паштовыя блокі маюць пазітыўны рэзананс у абедзвюх краінах, займаюць годнае месца ў калекцыях філатэлістаў.

З Рэспублікай Арменія гэта, дарэчы, ужо другі сумесны выпуск. Першы, прысвечаны Мінску і Ерэвану, быў выпушчаны два гады таму.

Валянціна ДОЎНАР

ПУСТЫ БАЛЬНІЧНЫ ЛОЖАК...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы прад'яўляем да якасці работы амбулаторна-паліклінічнага звяна самыя высокія патрабаванні: гэтыя арганізацыі павінны быць фільтрамі, якія прапускаюць праз сабе насельніцтва, усебакова ацэньваючы яго здароўе, — падкрэсліў Ігар Ласіцкі. — Яны павінны браць пад улік кожны выпадак захворвання, прызначаць своечасовае і адэкватнае лячэнне, назіраць за змяненнямі ў стане здароўя пацыента, прымяняць на практыцы метады прафілактыкі. Не сакрэт, што, калі першаснае звяно працуе неэфектыўна, а ўрачы прапускаюць хваробу на пачатковым этапе, гэта цягне за сабой неабходнасць задзейнічаць стацыянарную дапамогу — высокатэхналагічную і больш дарагую.

Але і ў стацыянарных арганізацыях фінансавыя сродкі павінны працаваць эфектыўна. Так, простай бальнічнага ложка не толькі не скарачае аб'ёмы стацыянарнай дапамогі, што фінансуюцца з бюджэту, але і пагаршае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва ўвогуле. Ложак, які працуе неэфектыўна, фінансуецца ў памеры 2/3 ад ложка, які працуе эфектыўна. Прасцей кажучы, пусты бальнічны ложак усё роўна забірае сродкі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Факт

ЕЎРОПА — ЗА ПУГУ, А ЗША — ЗА ПЕРНІК?

У палітыцы і эканоміцы, як і ў добрым жарце, галоўнае — трапны момант. На мой погляд, гэты момант заўважыў Еўрасаюз і добра ім скарыстаўся. Еўра зноў набірае вагу.

Прыпыненне працы ўрада ЗША на два тыдні не засталося не заўважаным іншымі краінамі. Праблема з дзяржаўным доўгам не вырашана, а проста адкладзена. У лютым наступнага года сітуацыя з недамоўленасцю паміж Кангрэсам і прэзідэнтам можа паўтарыцца. І хто ведае, чым яна скончыцца. У такіх умовах чакаць нейкіх рашучых захадаў ад ЗША няма сэнсу.

У сваю чаргу, Еўрапейскі саюз, скарыстаўшыся зручным момантам, заяўляе аб тым, што будзе жорстка адбіраць банкі. Еўрапейскі Цэнтрабанк на пачатку наступнага года пачне маніторынг «грашовых скрынь» — правал стрэс-тэста будзе прычынай для пачатку працэдуры банкруцтва. Гэтая навіна вельмі ўмацавала веру інвестараў у еўра. Таму відаць, што Еўрасаюз выбраў палітыку «пугі», а ЗША — «перніка». Паглядзім, чыя пазіцыя будзе больш выгаднай.

Да беларускага рубля за гэты тыдзень долар падаражэў на 20 рублёў (плюс 0,2%) да 9170. Еўра падняўся на 160 рублёў (плюс 1,3%) да 12670. Расійскі рубель падаражэў на 2 грашовыя адзінкі (плюс 0,7%) да 289,5.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПЛАСТЫКА ХОРУ

Дзяржаўны камерны хор рэспублікі Беларусь адзначае сваё 25-годдзе канцэртам 26 кастрычніка. Паколькі вечар урачысты, то віншаваць яго будуць вядомыя калектывы. Адзін з іх — Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь. Госцем канцэрта стане Вільнюскі камерны хор.

Кіраўнік Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь Наталля Міхайлава тлумачыць:

— Мы адзначым наш юбілей у Вялікай зале філармоніі пры ўдзеле тых музыкантаў, якіх мы хацелі б бачыць, сваіх сяброў. Сумесна з сімфанічным аркестрам мы выканаем 4 духоўныя п'есы Джузэпе Вердзі. Хоць ён не быў яўна веруючым чалавекам, але пакінуў цудоўныя ўзоры духоўнай музыкі: яго «Рэквіем» доўга будзе ўзрушаць слухачоў. Як і гэтыя 4 п'есы, якія ён напісаў у розныя перыяды сваёй творчасці, а напрыканцы жыцця сабраў і зрабіў цыклам. 2 з іх гучаць акапэльна, а 2 — з аркестрам. У іх ёсць водгукі яго опер. Мы імкнёмся працаваць так, каб у кожным канцэрце была нейкая прэм'ера. У першым аддзяленні рыхтуем прэм'еру беларускай кампазітаркі Ларысы Сімаковіч, з якой хор доўгі час супрацоўнічаў, калі яшчэ толькі пачынаў сваю гісторыю разам са сваім стваральнікам Ігарам Мацюховым. Цікавая рэжысура Ларысы Сімаковіч, яна працуе з пластыкай: нашы салісты выступаюць як акцёры, мы ўвесь час даказваем, што нездарма называемся артыстамі дзяржаўнага камернага хору. Мы павінны ўмець рухацца, мы павінны ўмець не толькі спяваць, але і паказваць тое, пра што спяваем. Мы не маглі абысціся без музыкі Віктара Капыцько, які стаяў ля вытокаў стварэння хору. Прагучаць і іншыя творы беларускіх кампазітараў. Праграма называецца «Усё лепшае і новае». Лепшае ўзялі са старых праграм, якія гучалі 25 гадоў таму. Сюрпрызы чакаюцца ад нашых гасцей — «Музычнай гасцёўні» і Вільнюскага хору.

Ларыса ЦІМОШЫК